# СТАТЫСТЫЧНАЯ ІНФАГРАФІКА ПА ВЫНІКАХ АНКЕТАВАННЯ АДМІНІСТРАТЫЎНА АРЫШТАВАНЫХ ПА ПАЛІТЫЧНЫХ МАТЫВАХ ЗА 2014 ГОД

Па дадзеных Праваабарончага цэнтра “Вясна”, на працягу 2014г. былі зафіксаваныя **104 факты** прыцягнення да адміністратыўнай адказнасці ў выглядзе арышту па палітычных матывах у дачыненні да **88 чалавек** (то бок, некаторыя з іх неаднаразова прыцягваліся да такой адказнасці)**.**

ПЦ “Вясна” правёў грунтоўнае анкетаванне[1] 40 выпадкаў адміністратыўнага пераследу ў дачыненні да **37 чалавек**, якія былі затрыманыя ў сувязі з грамадскай і палітычнай дзейнасцю і панеслі адказнасць у выглядзе адміністратыўнага арышту, што складае **38,5 %** ад усіх зафіксаваных фактаў прыцягнення да адміністратыўнай адказнасці па палітычных матывах. Гэтыя асобы звярнуліся ў грамадскую прыёмную арганізацыі і выказалі жаданне адказаць на 95 пытанняў, датычных стадый затрымання, знаходжання ў аддзяленні міліцыі, судзе і ўмоваў адбыцця пакарання.

Паводле дадзеных 40 анкетаў, 4 выпадкі затрымання і адбывання пакарання мелі месца ў Барысаве, 1 - у Гародні, 1- у Слоніме, 1 - у Наваполацку, 1 - у Ельску (затрыманне адбывалася на мяжы з Украінай), астатнія 32 – у Менску (Малюнак 1).

**Малюнак 1. Гарады – месцы затрыманняў**




15 затрыманых адзначылі, што не з’яўляюцца сябрамі грамадскай альбо палітычна арыентаванай арганізацыі.

[1] Анкета была распрацаваная у 2012 годзе сумеснымі намаганнямі праваабарончых арганізацый: Беларускі Хельсінкскі Камітэт, Цэнтр прававой трансфармацыіі Lawtrend, Праваабарончы цэнтр “Вясна”, Цэнтр па правах чалавека.

Узрост затрыманых – ад 18 да 72 гадоў.

Анкетаванне адбывалася па трох раздзелах: 1) Абставіны затрымання і транспартыроўкі; 2) Суд; 3) Умовы ўтрымання ў ізалятары.

### 1) Абставіны затрымання і транспартыроўкі

На пытанне “Ці прадставіліся асобы, якія ажыццяўлялі затрыманне?” большасць апытаных адказала адмоўна (25 з 40 – 62,5%), у 7 выпадках супрацоўнікі міліцыі прад’явілі дакументы, у 8 – прадставіліся толькі вусна.




Пры гэтым у 30 выпадках затрыманым тлумачылі падставу іх затрымання (75%), а ў 10 – не (25%)[2].




[2] “Супрацоўнік органаў унутраных спраў ва ўсіх выпадках абмежавання правоў і свабодаў грамадзяніна абавязаны растлумачыць яму падставы для такога абмежавання, а таксама яго правы і абавязкі, якія ўзнікаюць у сувязі з гэтым” – артыкул 23 Закона “Аб органах унутраных спраў Рэспублікі Беларусь”.

Ні ў адным з апісаных выпадкаў затрыманым не тлумачылі іх правы і абавязкі у момант затрымання; толькі ў 9 выпадках – у РУУСе, а пераважнай большасці апытаных (31 – 78%) на дадзенай стадыі правы і абавязкі не патлумачылі.




У 11 выпадках (27,5%) асобы ўказалі пра ўжыванне да іх ці іншых фізічнай сілы, у 10 з гэтых выпадкаў – на стадыі затрымання.




Таксама ў 7 выпадках (17,5%) быў адзначаны адказ пра ўжыванне спецсродкаў (у 3 выпадках – кайданкі).




На ўсіх анкетаваных былі складзеныя пратаколы аб адміністратыўным правапарушэнні. Паводле тэндэнцыі апошніх часоў, часцей складаецца больш за адзін пратакол з мэтай ізаляцыі на больш працяглы тэрмін. Сярод апытаных у 14 выпадках (35%) былі складзеныя пратаколы за “дробнае хуліганства” і “непадпарадкаванне службовым асобам”. На другім месцы – пратаколы толькі за дробнае хуліганства (12 – 30%), у 9 выпадках (22,5%) – пратаколы за несанкцыянаваныя сходы.



Пры гэтым абсалютна ва ўсіх выпадках пратаколы аб адміністратыўных правапарушэннях складаліся ў аддзяленні міліцыі.

У большасці выпадкаў пры затрыманні супрацоўнікі міліцыі адмаўляюцца паведаміць родным пра месцазнаходжанне асобаў[3]: у 22 адказах (55%) супрацоўнікі міліцыі адмовіліся паведаміць родным па просьбе затрыманых пра іх статус, у 9 выпадах далі магчымасць паведаміць і толькі ў 2 зрабілі гэта самі.




На пытанне “Ці забяспечвалі своечасовае харчаванне да адбыцця пакарання?” толькі 12 чалавек адказалі станоўча (30%).

[3] “3. Па просьбе фізічнай асобы, затрыманай за здзяйсненне адміністратыўнага правапарушэння, аб месцы яе знаходжання на працягу трох гадзін паведамляецца паўналетнім членам яе сям'і, блізкім сваякам, абаронцу, наймальніку, з якім затрыманы знаходзіцца ў працоўных адносінах, адміністрацыі ўстановы адукацыі, навучэнцам або студэнтам якой яна з'яўляецца” – артыкул 8.2. Працэсуальна-выканаўчага кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністратыўных правапарушэннях.




Адносна абыжоджання з боку супрацоўнікаў міліцыі толькі у 9 анкетах (23%) было адзначанае ветлівае і культурнае стаўленне, у астаніх адзначалі лаянку і прыдзіркі.




У 25 выпадках (62,5%) затрыманым не тлумачылі права на абароцу[4]. Толькі ў 1 выпадку затрыманы меў магчымасць карыстацца дапамогай прадстаўніка.

[4] “Фізічная асоба, у адносінах да якой вядзецца адміністратыўны працэс, мае права на абарону. Гэтае права яна можа ажыццяўляць як асабіста, так і з дапамогай абаронцы ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам» - артыкул 2.8. Працэсуальна-выканаўчага кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністратыўных правапарушэннях.




Роўна ў палове выпадкаў супрацоўнікі міліцыі давалі затрыманым магчымасць азнаёміцца з матэрыяламі адміністратыўнай справы[5].




## 2) Суд

Паводле інфармацыі ў анкетах, працягласць судовага разгляду дадзеных адміністратыўных спраў складала ад 5 хвілінаў да 4.5 гадзінаў. Толькі 4 адказы (10%) сведчаць пра дакладнае тлумачэнне правоў асобы пры судовым разглядзе справы, у астатніх выпадках суддзя пералічыў нумары артыкулаў (11 адказаў – 27%), пералічыў каталог правоў (18 адказаў – 45%), у 7 выпадках (18%) правы не патлумачылі зусім.

[5] “1. Фізічная асоба, у адносінах да якой вядзецца адміністратыўны працэс, мае права: ... 9) знаёміцца з пратаколам аб адміністратыўным правапарушэнні, а таксама матэрыяламі справы аб адміністратыўным правапарушэнні па заканчэнні падрыхтоўкі яе да разгляду і ў іншых выпадках па сваім хадайніцтве, рабіць выпіскі з іх, з дазволу органа, які вядзе адміністратыўны працэс, здымаць копіі з гэтых матэрыялаў» - артыкул 4.1. Працэсуальна-выканаўчага кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністратыўных правапарушэннях.




Пры гэтым у 7 анкетах (17,5%) была пазначаная інфармацыя аб тым, што затрыманыя мелі складанасці ў разуменні правоў і выкарыстанні іх падчас судовага паседжання.




Амаль палова затрыманых (19 – 47,5%) мелі абаронцу ў судовым паседжанні. Пры гэтым у пераканаўчай большасці спраў (31 – 77%) у якасці сведак выступалі супрацоўнікі міліцыі.




Судовае рашэнне па анкетах - ад 5 да 25 сутак адміністратыўнага арышту:




## 3) Умовы ўтрымання ў ізалятары

У 15 выпадках (37%) былі адзначаныя факты правядзення медычнага агляду пры паступленні ў ізалятар.



Толькі ў 5 выпадках (13%) не праводзіўся асабісты дагляд пры паступленні ў ізалятар, у 1 – праводзіўся асобай іншага полу.




У большасці выпадкаў (22 - 55%) супрацоўнікі не тлумачылі правы і абавязкі пры паступленні ў ізалятар, у 13 выпадках (33%) – няпоўна і незразумела.




Толькі ў 6 выпадках (15%) супрацоўнікі ізалятару паведамілі родным пра знаходжанне там затрыманай асобы, а ў 23 (57%) – не, хоць іх прасілі гэта зрабіць.




З апісання ўмоваў у камерах вынікае, што ў найбольшай колькасці камераў адсутнічала вентыляцыйнае абсталяванне (57,5%), толькі ў 3 камерах (7,5%) былі настольныя гульні.



Адносна санітарнага стану камеры ў анкетах большасць апытаных адзначыла “незадавальняльны” (бо “мошкі, цвіль, кепская вентыляцыя, адсутнасць дзвярэй у санвузле” і інш.) – 26 адказаў (65%). У 8 анкетах (20%) санітарны стан ацэньваецца як “добры”.




Амаль у палове выпадкаў (19 – 47%) затрыманым выдавалі спальныя прыналежнасці кепскай якасці, у 1 - не выдавалі зусім.



Пры атрыманні перадачаў у 82,5%  рэчы супадалі са спісам, якія прапісваўся ў заяве аб перадачы.




У большасці выпадкаў не выдаваліся сродкі асабістай гігіены (25 – 63%).




У 10 выпадках (25%) затрыманым не прадстаўлялася магчымасць карыстацца душам, астатнім дазвалялі гэта з рознай перыядычнасцю (ад 1 разу на 2 сутак да 1 разу на 13 сутак).




У 26 адказах (65%) сцвярджалася, што было недастатковае асвятленне (не працавалі лямпачкі, у камеры мала дзённага святла).




Больш за палову апытаных (22 – 55%) ацанілі тэмпературны рэжым у камеры як камфортны, але ў 14 выпадках (35%) тэмпература была занадта халоднай.




Толькі у 5 выпадках (12%) затрыманых выводзілі на прагулкі штодзень, у 9 (23%) - не выводзілі зусім, а большую частку затрыманых выводзілі 1 раз за 2 - 11 сутак.




Толькі 1 чалавек пазначыў перашкоды ў доступе да адваката, 28 (70%) - не мелі з гэтым праблем.




Большасць, у 24 (60%) адказах, ацанілі якасць харчавання як нездавальняльную.




Адносна прэтэнзій да персаналу ізалятара меркаванні падзяліліся: у 22 выпадках (55%) не было прэтэнзій, а ў астатніх 18 (45%) – затрыманыя былі незадаволеныя абыходжаннем.




У 9 выпадках (22,5%) былі адзначаныя перашкоды для магчымасці абскарджвання судовай пастановы і дзеянняў супрацоўнікаў міліцыі.




Толькі ў 52,5% апытаных вызваленне адбылося своечасова, калі ў 23% выпадкаў затрыманых дадаткова вывозілі ў аддзяленні міліцыі.


Вызваленне адбылося:
23%
10%
15%
52%
Своечасова
Раней
З затрымкай
З парушэннямі (вывезлі у аддзяленні міліцыі)